# ЯКОЙ БЫЦЬ ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫІ

**М. М. РАГАНОЎСКІ,**
**дацэнт Магілёўскага педінстытута імя А. А. Куляшова**

Перабудова нашай агульнаадукацыйнай школы неапраўдана зацягнулася і выклікае справядлівыя нараканні грамадства. Новаўвядзенні пакуль што носяць абмежаваны, фрагментарны характар і не прыводзяць да істотных змен якаснага ўзроўню навучання і выхавання падрастаючага пакалення. Думаецца, што тут не хапае самага галоўнага — пэўнасці і апаратыўнасці. У сувязі з гэтым хочацца выказаць некаторыя ўласныя думкі аб канцэпцыі сучаснай школы.

Перш за ўсё, важнейшай умовай паскарэння перабудовачных працэсаў з'яўляецца выпрацоўка цэласнай канцэпцыі сучаснай школы, яе мэт, арганізацыйных прынцыпаў (дэмакратызацыя, гуманітарызацыя, дыферэнцыяцыя і індывідуалізацыя), структуры адукацыі.

Як адзначалася на Усесаюзным з'ездзе работнікаў народнай адукацыі, перад школай стаяць дзве праблемы: сфармуляваць мэту, якая не зводзілася б толькі да падрыхтоўкі вучняў для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, і ўзмацніць у змесце агульнай сярэдняй адукацыі маральна-духоўны аспект. Не супрацьпастаўляючы адно аднаму, неабходна прызнаць прыярытэт выхаваўчых і развіццёвых задач. Але аднаго такога прызнання яшчэ недастаткова. Неабходна навучыць школьнікаў жыць па законах дэмакратычнага грамадства, ператварыць прынцыпы дэмакратызацыі ў нормы паўсядзённага школьнага жыцця. Гэтаму павінна садзейнічаць практыка ўзаемаадносін паміж самімі вучнямі, а таксама паміж настаўнікамі і школьнікамі. Фармалізм і заарганізаванасць тут далёка яшчэ не пераадолены. Трэба больш актыўна прыцягваць вучняў да розных форм самакіравання, супрацоўніцтва ў вырашэнні ўсіх школьных спраў. У дэмакратызацыі ўнутрышкольных адносін больш творчай ініцыятывы павінны праяўляць самі школьныя калектывы, бо інструкцыямі і загадамі зверху ўсталяваць дэмакратызм немагчыма. Кожная школа можа мець свае формы дэмакратызацыі ўнутрышкольных адносін, свой стыль. Важна, каб гэтыя формы былі падказаны самімі школьнікамі, адлюстроўвалі іх інтарэсы, былі дастаткова гібкімі, не мелі стандартнай схемы.

Узмацненне выхаваўчай ролі школы непазбежна звязана з гуманітарызацыяй адукацыі. Для вырашэння гэтай праблемы недастаткова аднаго толькі павелічэння ў раскладах гадзін на вывучэнне прадметаў гуманітарнага цыкла. Важна, каб гуманітарны аспект прысутнічаў у кожным навучальным прадмеце. А гэта патрабуе значных змен у змесце падручнікаў. Першыя крокі ў гэтым кірунку ўжо зроблены, але яны яўна недастатковыя. У прыватнасці, праблемны падыход да навучання не знайшоў належнага адлюстравання нават у апошніх, конкурсных падручніках. А без гэтага немагчыма стварыць рэальныя ўмовы для развіцця творчых інтарэсаў і схільнасцей усіх вучняў.

Нельга не спыніцца і на структуры школы. Яна павінна адпавядаць прынцыпам дыферэнцыяцыі навучання і забяспечваць выбар вучнем розных шляхоў атрымання агульнай сярэдняй адукацыі. Асаблівых клопатаў і ўвагі патрабуе пачатковая школа. Яна павінна мець уласнае памяшканне ці асобны блок. Не сакрэт, што пачаткоўцы з цяжкасцю ўцягваюцца ў новае для іх школьнае жыццё. Для іх патрабуецца асобны рэжым дня, навучальнай работы. Менавіта тут, у пачатковай школе, вучні павінны атрымліваць трывалыя веды для працягу далейшай вучобы. Думаецца, што для пачаткоўцаў у апошнім класе мэтазгодна было б увесці своеасаблівыя выпускныя экзамены.

У сувязі з новымі падыходамі да нацыянальнай палітыкі асабліва востра стаіць пытанне аб выбары мовы навучання ў школах. Крайнасці тут непажаданыя, бо яны могуць нашкодзіць справе. У нацыянальных рэспубліках з вялікім працэнтам рускага насельніцтва мэтазгодна мець школы, дзе навучанне вядзецца на нацыянальнай мове, а руская вывучаецца як асобны прадмет, а таксама школы, у якіх дзеці навучаюцца на рускай, а мова карэннага насельніцтва вы-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

вучаецца ў якасці асобнага прадмета. Рашаючым у выбары мовы навучання павінна стаць жаданне бацькоў і саміх дзяцей. Такая сістэма паспрыяе ўзаемнай павазе нацый, выключыць любую форму самавольства і ўціску нацыянальнай годнасці, будзе адпавядаць самым высокім нормам сацыялістычнай дэмакратыі. У двухмоўных рэспубліках, дзе апрача нацыянальнай і рускай вывучаецца яшчэ замежная мова, час навучання можна было б павялічыць на год.

На дыферэнцыяцыю павінна быць накіравана і сама структура адукацыі. За перыяд навучання ў V — IX класах прыкметна выяўляецца дыферэнцыяцыя вучняў не толькі па паспяховасці, але і па арыентацыі на будучую прафесію. Як вядома, пасля заканчэння няпоўнай сярэдняй школы значная частка вучняў пачынае праяўляць жаданне пачаць працоўную дзейнасць у прамысловай вытворчасці, будаўніцтве, сельскай гаспадарцы, сферы абслугоўвання і г. д. У такіх выпадках можна было б аднавіць існаваўшую раней на прадпрыемствах форму вучнёўства, а таксама накіроўваць моладзь у спецыяльна створаныя прафтэхвучылішчы, у якіх за кароткі час можна атрымаць рабочую спецыяльнасць невысокай складанасці. Пры гэтым трэба кіравацца тым, што далейшае павышэнне прафесіянальнай кваліфікацыі будзе абавязкова ўвязвацца з працягам вучобы ў вячэрняй, завочнай сярэдняй школе ці на вячэрнім аддзяленні тэхнікума.

Адукацыя можа быць усеагульнай у тым сэнсе, што ўся наша моладзь да 16—17 гадоў павінна вучыцца ў пэўнай навучальнай установе. Існуючае ж цяпер патрабаванне абавязковасці сярэдняй адукацыі, якое часам пераходзіць у прымусовае, нельга нічым апраўдаць. Практыка паказвае і тое, што ранняя, стыхійная арыентацыя моладзі на абавязковую сярэднюю адукацыю прыводзіць да таго, што асобныя прадметы, якія з пункту погляду вучняў не спатрэбяцца ў будучым, яны вывучаюць пад прымусам. Недасканаласць жа структуры агульнай сярэдняй адукацыі прыводзіць яшчэ і да таго, што на асобных вучняў, у якіх не ляжыць душа да тых ці іншых дысцыплін, навешваюцца ярлыкі няздольных. У выніку пакутуюць і дзеці, і іх бацькі, ды і самі настаўнікі.

Нельга не закрануць і праблемы экзаменаў. Пры рэальным павышэнні аб'ектыўнасці ацэнкі ведаў, думаецца, няма неабходнасці захапляцца вялікай колькасцю выпускных і прамежкавых экзаменаў. Калі дапусціць, што ў V — IX класах штогод мяркуецца праводзіць па два экзамены, дык ужо толькі іх набіраецца ажно дзесяць. Таму пасведчанне аб заканчэнні няпоўнай сярэдняй школы можна было б выдаваць па выніках двух выпускных экзаменаў, прамежкавых экзаменаў і выстаўленых выніковых адзнак па асобных прадметах. Тым вучням, якія паспяваюць на 4 і 5, адзнака па прамежкаваму экзамену з іх згоды магла б выстаўляцца аўтаматычна. Адзін з варыянтаў заключаецца ў тым, каб даваць магчымасць самім вучням выбіраць прадметы, па якіх праводзяцца выпускныя экзамены. Гэта сведчыла б аб планах выпускнікоў па спецыялізацыі іх далейшага навучання. Аднолькава гэта датычыць і прамежкавых экзаменаў. А вось уступны экзамен у поўную сярэднюю школу быў бы дарэчы. У тэхнікумах і многіх СПТВ такія экзамены з'яўляюцца заканамернымі. Чаму ж тады не распаўсюдзіць гэту заканамернасць і на старэйшую ступень агульнаадукацыйнай сярэдняй школы? Тым больш, што яна раўназначна спецыяльным сярэднім навучальным установам, якія даюць, апрача прафесіі, таксама агульную сярэднюю адукацыю. Такім чынам, уступны экзамен на конкурснай аснове ў старэйшую ступень агульнаадукацыйнай сярэдняй школы стаў бы добрым стымулам для атрымання паўнацэннай адукацыі вучнёўскай моладдзю. Пры гэтым уступны экзамен у X клас, як і выпускныя з дзевяцігадовай школы, мэтазгодна было б праводзіць з улікам выбару вучнямі напрамку навучання.

Варта спыніцца і на шляхах дыферэнцыраванага навучання пры атрыманні моладдзю агульнай сярэдняй адукацыі. У X — XI класах абмежавацца двума напрамкамі дыферэнцыяцыі — акадэмічным і тэхнічным, якія з улікам магчымасцей настаўніцкіх кадраў, патрэбнасцей рэгіёнаў могуць дзяліцца на розныя секцыі (гуманітарныя, прыродазнаўчанавуковыя, фізіка-матэматычныя — на акадэмічным, і на секцыі, зарыентаваныя на прамысловасць, сельскую гаспадарку, сферу абслугоўвання насельніцтва,— на тэхнічным напрамку). У Францыі, напрыклад, такіх секцый у школах налічваецца больш за дваццаць.

Адна з асноўных форм дыферэнцыяцыі ў старэйшых класах заключаецца ў скарачэнні колькасці абавязковых для вывучэння прадметаў і магчымасці іх выбару самімі вучнямі. Гэта форма знаходзіць шырокае прымяненне ў міжнароднай практыцы. У Англіі, напрыклад, дыферэнцыяцыя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

навучання пачынае вызначацца ўжо з IV класа сярэдняй школы. Каля палавіны навучальнага часу адводзіцца на абавязковыя прадметы, якія складаюць ядро праграмы, астатні час — на прадметы па выбару. Да асноўных прадметаў належаць англійская мова і літаратура, матэматыка, фізічная культура і рэлігія. Прадметы па выбару групуюцца ў пяць блокаў, кожны з якіх складаецца з 5-6 навучальных курсаў. З кожнага блока вучань выбірае па чатыры прадметы. Гэта складае дваццаць урокаў у тыдзень, а разам з абавязковымі — сорак урокаў. Урокі працягваюцца па 35 мін. і звычайна бываюць спаранымі.

У ЗША паглыбленая дыферэнцыяцыя праводзіцца ў X—XII класах. Блок абавязковых прадметаў тут скарочаны да трох. У яго ўваходзяць англійская мова, грамадазнаўства і фізічная культура. Для выбару неабавязковых прадметаў вучням прапануецца да двухсот курсаў. З X класа навучанне вядзецца на адным з трох патокаў: акадэмічным, прафесіянальным і агульным.

У Францыі ў трохгадовым ліцэі на першым годзе навучання асноўнае месца займаюць абавязковыя прадметы: французская мова, замежная мова, матэматыка, фізіка, прыродазнаўства, гісторыя, геаграфія, грамадазнаўства і фізічная культура. Тут дыферэнцыраванае навучанне ажыццяўляецца за кошт факультатыўных курсаў, на якія адводзіцца ад трох да адзінаццаці гадзін у тыдзень. Узмацненне дыферэнцыяцыі пачынаецца з другога года навучання. Ліцэісты размяркоўваюцца па агульнаадукацыйных і тэхнічных секцыях, якіх налічваецца больш за два дзесяткі.

Вопыт зарубежнай школы сведчыць аб тым, што ні адна з існуючых форм дыферэнцыяцыі не з'яўляецца аптымальнай. Таму і ў нас яны могуць быць самымі рознымі.

У нашай краіне пакуль што няма дастатковага вопыту дыферэнцыраванага навучання. Таму на першым часе не варта імкнуцца да стварэння нейкага аднаго пэўнага варыянта. У розных рэгіёнах мэтазгодна было б апрабаваць альтэрнатыўныя варыянты, а затым ужо на аснове назапашанага вопыту правесці адбор найбольш перспектыўных. На адным з такіх альтэрнатыўных варыянтаў хочацца спыніцца больш падрабязна. Да блока абавязковых прадметаў можна аднесці наступныя чатыры: родную мову і літаратуру, гісторыю і грамадазнаўства, матэматыку, фізічную культуру. На вывучэнне гэтых прадметаў трэба выдзеліць не менш за 50 % навучальнага часу. І абавязковыя дысцыпліны, і прадметы па выбару мэтазгодна выкладаць на двух узроўнях — агульнакультурным і павышаным. Патрабаванне абавязковасці вывучэння некаторых прадметаў азначае, што па іх вучань павінен выбраць для сябе пэўны курс — агульнакультурны ці павышаны. Да прыкладу, аднясенне матэматыкі да ліку абавязковых прадметаў (гэта стасуецца з міжнароднай практыкай) дапускае наступныя варыянты для вучня: ён выбірае агульнакультурны курс і толькі ім абмяжоўваецца; выбірае павышаны курс, а агульнакультурны не вывучае.

Непажаданы крайнія формы дыферэнцыяцыі, якія адыгрываюць свайго роду ролю «ліфта, што рухаецца ўніз», і рэдка даюць магчымасць вучню, які дапускае некаторае адставанне, павысіць узровень свайго навучання. Пазбегнуць прымітывізму, нейкага лікбезу ў агульнакультурным курсе і скараціць магчымыя «ножны» паміж гэтым і павышаным курсамі можа дапамагчы наступнае: у змест агульнакультурнага курса павінна ўваходзіць не менш за 75—85 % зместу павышанага курса. Такія суадносіны даюць рэальныя магчымасці вучню павысіць узровень свайго навучання і пры неабходнасці перайсці ад агульнакультурнага курса да павышанага. Пры «ножнах», што перавышаюць 25 %, пераход на павышаны курс становіцца практычна немагчымым. Улічваючы ўсё гэта, у X—XI класах пажадана раз у паўгода ставіць пытанне аб пераводзе некаторых вучняў на павышаны курс навучання. Тым самым можна было б своечасова ўлічваць магчымыя змены ў першапачатковай прафарыентацыі вучняў.

**Ад рэдакцыі. Не ўсё ў меркаваннях аўтара бясспрэчна. Але многія прапановы заслугоўваюць пільнай увагі і могуць быць выкарыстаны педагагічнымі калектывамі пры арганізацыі дыферэнцыраванага навучання школьнікаў.**



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова